***А. А. Рамашкевіч,***
*выкладчык*

# ТВОРЧЫ ШЛЯХ Г. І. ЦІТОВІЧА: ГІСТОРЫЯГРАФІЯ ПЫТАННЯ

Таленавіты чалавек таленавіты ва ўсіх сваіх праявах. Такім быў Генадзь Іванавіч Цітовіч у харавым мастацтве, фалькларыстыцы, этнаграфіі, у сваёй грамадскай рабоце і ў кампазітарскай творчасці.

У сучаснай культуры пазначыўся выразны паварот да народнага мастацтва. Але творчы шлях Г. І. Цітовіча недастаткова вывучаны ў Беларусі нават у прафесійным харавым асяроддзі. Матэрыялы, прысвечаныя яго дзейнасці, маюць фрагментарны і ў асноўным апісальны характар. У снежні 2010 г. з нагоды стагоддзя з дня нараджэння Г. І. Цітовіча ў Мінску была праведзена рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная яго творчай спадчыне. Сярод навукоўцаў, якія займаліся асобай вядомага хормайстра і фалькларыста, былі Т. Варфаламеева, У. Зяневіч, В. Калацэй, Т. Пладунова, Л. Ражкова, С. Русецкі, Э. Шчадрына.

Зацікаўленасць і захапленне музыкай пачалося ў будучага хормайстра яшчэ ў гады вучобы ў Віленскай гімназіі пры Праваслаўнай духоўнай семінарыі. Але яго бацька не думаў, што сын пойдзе ў святары. Яму проста важна было даць дзіцяці добрую адукацыю. Генадзь меў цікаўнасць да ведаў. Яго сабранасць і мэтанакіраванасць дазвалялі займацца многімі справамі і ўсюды паспяваць. Асабліва спадабалася хлопцу ўдзельнічаць у хоры гімназістаў і семінарыстаў, кіраўніком якога быў Рыгор Шырма. Генадзь спяваў у партыі басоў. Акрамя таго, ён паспяхова прайшоў абавязковы для семінарыі курс рэгента – кіраўніка царкоўнага хору.

Атрымаўшы атэстат сталасці, Цітовіч паступіў у Віленскі ўніверсітэт на прыродазнаўча-матэматычны факультэт. Але па складу свайго мыслення ён быў гуманітарыем, захапляўся літаратурай, гісторыяй, музыкай і фальклорам. Адзін з тагачасных універсітэцкіх прафесараў, кампазітар Тадэвуш Шэлігоўскі, які пазнаёміўся з этнаграфічнымі запісамі студэнта Цітовіча і ўбачыў у ім таленавітага даследчыка, параіў яму паступіць у Віленскую кансерваторыю, што той і зрабіў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Збіраць народныя песні Г. Цітовіч пачаў на Лагойшчыне, Ашмяншчыне і ў наваколлі Вільні. Гэта былі мясціны, дзе спявалі ў асноўным аднагалосна. У 1932 г. малады фалькларыст упершыню паехаў на Палессе, і гэта вандроўка вызначыла яго далейшы творчы лёс. Вось што ўспамінаў Г. Цітовіч: «Нібы дзіўны свет адкрыўся перада мной, я трапіў у чароўную краіну шматгалосся. Паездка вырашыла мой далейшы лёс. Я канчаткова звязаў яго не толькі з песняй, але і з Палессем: пры кожным зручным выпадку еду сюды»[1].

Праз чатыры гады праездам у Баранавічы малады чалавек трапіў у вёску Вялікае Падлессе. Тады і не думалася яму, што лёс так блізка звяжа яго са спевакамі гэтага мястэчка. Ён толькі спыніўся запытаць пра песні, а яму адказалі, што сяло сапраўды пявучае. І вось у 1939 г. ужо з дыпломам Віленскай кансерваторыі Г. Цітовіч прыехаў у Баранавічы і стаў працаваць адказным рэдактарам абласнога радыё і кансультантам Дома народнай творчасці. У яго абавязкі ўваходзіла кантраляваць самадзейнае выканальніцтва вобласці. Але займацца толькі кабінетнымі справамі Цітовіч не хацеў. Ён выязджаў у вёскі, даследаваў народную культуру, запісваў фальклор.

Так пачаў адкрывацца ўнікальны народна-мастацкі і чалавечы талент Г. І. Цітовіча. Ён пачынае здзяйсняць сваю мару: у Вялікім Падлессі стварыць народны хор, які б данёс слухачам хараство і непаўторнасць беларускай народнай песні, пазнаёміў бы публіку са знакамітым палескім шматгалоссем «з падводкай». Падчас Першай дэкады беларускага мастацтва ў Маскве выступленне самадзейных артыстаў пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча мела велізарны поспех. Але радасць спевакоў была кароткай, усе планы бязлітасна перакрэсліла вайна. На доўгія пяць гадоў змоўклі песні ў Вялікім Падлессі.

Як толькі Беларусь была вызвалена ад акупантаў, удзельнікі Падлескага хору пачалі збірацца зноў. Пад кіраўніцтвам Г. Цітовіча ў 1952 г. гэты калектыў быў ператвораны ў Дзяржаўны народны хор БССР, які з часам стаў адметнай з’явай у беларускай культуры. Росту прафесійнага майстэрства, развіццю самабытнага выканальніцкага стылю спрыялі гарачая захопленасць і творчая зацікаўленасць дырыжора. Ён зрабіў тысячы фальклорных запісаў, пазнаёміўся з многімі выдатнымі народнымі спевакамі, якіх

[1] *Ліцвінка, В.* Ад самадзейнага – да акадэмічнага / В. Ліцвінка // ЛіМ. – 1981. – № 1. – С. 42–44.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

запрашаў да сябе ў хор, заражаў кожнага артыста энтузіязмам, пяшчотнай любоўю да беларускай песні.

Працаваць з Генадзем Іванавічам было і цікава, і весела. Як у хормайстра ў яго спалучаліся дасціпнасць і прастата абыходжання з вялікім прафесійным вопытам, адданасцю сваёй справе. Ён дасканала ведаў жанр песні, таму дамагаўся крыштальнай выразнасці кожнага гуку. Спачатку ён працаваў асобна з кожнай групай галасоў, а калі адчуваў гучанне груп, пераходзіў да агульных рэпетыцый. Пры гэтым шмат увагі ён надаваў індывідуальнай працы са спевакамі, і тыя цяжкасцей не заўважалі, паколькі ўвесь час з вуснаў іх дырыжора сыпаліся вясёлыя прыказкі і прымаўкі. У тыя гадзіны рэпетыцый ім былі закладзены асноўныя традыцыі хору, якія жывуць і сёння.

Пад кіраўніцтвам Г. І. Цітовіча Дзяржаўны народны хор БССР стварыў багаты і разнастайны рэпертуар. Сам ён з'яўляецца аўтарам дванаццаці арыгінальных партытур і больш за шэсцьдзесят апрацовак народных мелодый. І па сёння гучаць на канцэртах такія створаныя ім песні, як «Рэчанька», «Жаваронačкі, прыляціце», «Ой, рана на Івана». У свой час просты, але меладычнай «Рэчаньцы» ў Маскве стоячы апладзіраваў сам Аляксандр Васільевіч Свешнікаў, расійскі дырыжор-хормайстар. Побач з Г. Цітовічам у хоры працавалі над аранжыроўкамі фальклору такія выдатныя музыканты, як К. Паплаўскі і М. Сірата. Акрамя таго, доўгі час Генадзь Іванавіч працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Акадэміі навук Беларусі. Ён быў музычным рэдактарам шматтомнага выдання «Вуснапаэтычная творчасць беларускага народа», з'явіўся складальнікам «Анталогіі беларускай народнай песні».

Свайму любімаму хору Генадзь Цітовіч быў верны да апошніх дзён жыцця. Ён радаваўся яго поспехам, быў заўсёды побач. З 1987 г., пасля смерці хормайстра, Дзяржаўны народны хор БССР носіць імя свайго заснавальніка і першага дырыжора. Тыя, хто ведаў Цітовіча асабіста, казалі, што калі не стала яго, усё наўкол нібы страціла свае фарбы. І сапраўды, без такіх светлых людзей, як Генадзь Іванавіч, жыццё становіцца шэрым. Аднак жа, калі слухаеш сёння беларускія песні ў выкананні народнага хору, разумееш, што імклівая постаць Цітовіча тут жыве, калектыў з гонарам трымаецца традыцый, закладзеных майстрам.

Г. І. Цітовіч як высокаадукаваны спецыяліст усім сваім жыццём паказаў прыклад адданасці і любві да беларускай народнай песні,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

зрабіў вялікі ўклад у справу захавання нацыянальнай фальклорнай спадчыны. Як дырыжор народнага хору імкнуўся распаўсюдзіць любоў да народна-песеннай творчасці, ператварыць беларускую песню на канцэртнай эстрадзе з «сялянкі ў свецкую даму».

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ